танцавальных рытмаў, бо рытм наогул належыць да арганічных умоў і патрабаванняў фізічнага і псіхічнага складу чалавека. Дзе ж вытокі жанру прыпеўкі? Беларуская прыпеўка ў мінулым была цесна звязана з танцам і выконвалася часцей за ўсе як прыпеў да яго. Пра гэту сувязь сведчаць самі назвы, якія даў народ прыпеўкам у розных мясцовасцях: падскокі, скакухі, плясухі, плясушкі, вытанкі, круцелкі і інш. Але вытокі прыпеўкі ўзыходзяць не толькі да танцавальных песенек; узоры прыпеўкавых форм знаходзім і ў гульнях-танцах, і ў карагодах, і ў вясельна-абрадавай паэзіі, і ў дударскай песнятворчасці. Ля калыскі беларускай прыпеўкі стаялі народныя музыкі-скамарохі, без якіх не праходзіла ў весцы ніводнае гулянне. Самастойнасць беларускай прыпеўкі яшчэ задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі прызнавалі першыя збіральнікі і даследчыкі рускай частушкі. Больш таго, даследчыкі прызнаюць, што руская частушка мела сваю папярэдніцу – беларускую прыпеўку.

Тэматыка прыпевак змянялася, набывала рознае гучанне і адлюстроўвала сацыяльныя з'явы жыцця, якія адбываліся ў краіне. Гэта былі прыпеўкі, прысвечаныя гераічным справам савецкіх людзей, барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, а потым і пра мірную, стваральную працу людзей, пра іх клопаты і радасці. Кожная прыпеўка – гэта сваеасаблівая мініяцюра. Цераз маленькі штрых, дэталь ствараецца цэлы вобраз; карціна, выклікаецца неабходны настрой. Прыпеўкі бываюць самыя розныя па свайму настрою. Адным з характэрных мастацкіх прыемаў прыпеўкі з'яўляецца паралелізм, прыпеўка нібы дзеліцца на дзве часткі, дзе адна з другой нібы параўнаюцца.

## ДРУГАСНЫЯ КРЫНІЦЫ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ ЯК СРОДАК КААРДЫНАЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

С.В.Зыгмантовіч
В.І.Саітава

Сярод інфармацыйных рэсурсаў рэспублікі значнае месца належыць бібліяграфіі бібліяграфіі. Уласцівыя ей мадэлюючая, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дагульняючая, прагнозная функцыі дазваляюць выкарыстоўваць яе дадзеныя ў працэсе кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю: пры прагназаванні і планаванні падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў, аналізе і ацэнцы вынікаў бібліяграфічнай работы. Сродкам каардынацыі складальніцкай дзейнасці бібліятэк выступаюць перспектыўныя паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў, да якіх трэба аднесці перспектыўныя і бягучыя міжведамасныя каардынацыйныя планы падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў у Рэспубліцы Беларусь. Суб'ектам каардынацыі гэтай дзейнасці з'яўляецца навукова-бібліяграфічны аддзел Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Ён жа ажыццяўляе падагульненне складальніцкай работы бібліятэк з дапамогай агляду бібліяграфічных дапаможнікаў за адпаведныя гады.

У апошнія гады выяўляецца тэндэнцыя да болей шырокага звяртання да другасных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі пры вырашэнні канкрэтных пашуковых задач, пры ўзаемавыкарыстанні бібліяграфічных рэсурсаў. Гэтаму спрыяюць розныя звенні сістэмы бібліяграфіі бібліяграфіі: універсальныя (агульныя) бібліяграфічныя дапаможнікі, паказальнікі выданняў буйнейшых бібліятэк рэспублікі за пэўны перыяд, паказальнікі краязнаўчых дапаможнікаў, даведнікі аб бібліяграфічных рэсурсах бібліятэк горада, каталогах і картатэках асобных бібліятэк.

Бягучая інфармацыя ў спецыяльных штогодніках дыферынцыравана адлюстроўвае звесткі аб друкаваных і неапублікаваных бібліяграфічных дапаможніках, створаных у рэспубліцы. Бібліяграфічныя звесткі аб паказальніках таксама друкуюцца ў раздзеле "Навінкі беларускага друку" бюлетэня "Новыя кнігі Беларусі". Інфармацыю аб замежных бібліяграфічных выданнях, якія паступілі ў бібліятэкі можна знайсці ў адпаведных бягучых каталогах.

Звесткі аб бібліяграфічных базах дадзеных даюцца эпізадычна, няпоўна, у асноўным у рэкламных праспектах асобных бібліятэк.

У мэтах інтэнсіфікацыі выкарыстоўвання бібліяграфічных рэсурсаў, каардынацыі намаганняў інфармацыйных органаў і бібліятэк па іх вытворчасці, пашырэнню магчымасцей рэтраспектыўнага і бягучага пошуку патрэбны пэўныя удасканаленні сістэмы бібліяграфіі бібліяграфіі як арганізацыйнага, так і метадычнага характару. Сярод іх неабходна, каб НБ РБ узяла на сябе функцыі інфар-

мавання аб крыніцах другаснай інфармацыі і стварыла фактаграфічныя і бібліяграфічныя базы дадзеных аб бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных цэнтрах, аб усіх крыніцах другаснай інфармацыі (даведачных і інфармацыйных выданнях, якія выходзяць у рэспубліцы і па-за яе межамі, каталогах і картатэках, банках і базах дадзеных). На гэтай базе бібліятэка магла б рыхтаваць бібліяграфічныя работы рознага прызначэння.

Неабходна стварэнне рэтраспектыўнага паказальніка, які б адлюстроўваў бібліяграфічныя дапаможнікі змястоўна і па аўтарскай прыкмеце звязаныя з Беларуссю і выданыя да 1917 г. незалежна ад мовы; прадоўжыць улік у рэтраспектыўных паказальніках бібліяграфічных дакументаў, якія выйшлі пасля 1973 г.

Адной з важных праблем з'яўляецца павышэнне аператыўнасці падрыхтоўкі і выпуску бягучага штогодніка "Паказальнік бібліяграфічных даведнікаў Беларусі", які сення выходзіць са значным спазненнем.

Патрэбна удасканаленне інфармацыі аб неапублікаваных бібліяграфічных дапаможніках: фарміраванне рэспубліканскага фонду гэтых дакументаў, павышэнне паўнаты адлюстравання бібліяграфічных спісаў, пашырэнне аб'ектаў бібліяграфавання, актывізацыя іх выкарыстання.

Актуальнай таксама з'яўляецца праблема стварэння зводных каталогаў аб даведачна-бібліяграфічных фондаў бібліятэк; стварэнне даведнікаў па бібліяграфічных рэсурсах у дапамогу спецыялістам, навуковым супрацоўнікам.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ У 1919-1929 гг.

Т.А.Сазонава (аспірантка)

Цікавасць да гісторыі, далекай і блізкай, складае найбольш характэрную і устойлівую прыкмету духоўнага жыцця Беларусі у апошнія часы. Гэты "дыялог з мінулым" тлумачыцца прагай самапазнання культуры, якая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў была рэзка абмежавана. У 1919-1929 гады пытанне арганізацыі бібліяграфіі у нацыянальных рэспубліках з'яўлялася адным з най



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ